# Сонечныя ўзоры рухаўскіх дываноў









**Яўген Сахута,**
вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар мастацтвазнаўства, прафесар

На пасяджэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны ў 2019 г. статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь быў нададзены яшчэ не так даўно даволі папулярнай, але апошнім часам амаль забытай традыцыі аздаблення насценных дываноў у тэхніцы аплікацыі саломай на тканіне, што лакалізуецца ў Старадарожскім раёне Мінскай вобласці. Гэтым было засведчана афіцыйнае прызнанне адметнай з'явы ў традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў, дэкларавана неабходнасць яе адраджэння, зберажэння, уключэння ў сучасныя культурныя працэсы.

Калі весці размову менавіта пра саламяную аплікацыю, то можа скласціся ўражанне, што ў гэтага віду народнай мастацкай творчасці гісторыя зусім не багатая: пачынаецца з 2–3-й чвэрці XX ст. На першы погляд, уяўляецца нейкай выпадковай кароткачасовай з'явай у традыцыйнай культуры з яе шматвяковымі традыцыямі. Калі ж глядзець шырэй, то аказваецца, што карані гэтай з'явы вельмі глыбокія, і зыходзяць яны з тых часоў, калі нашыя продкі-земляробы нажалі першы жытні сноп, а пасля яго абмалоту салому выкарыстоўвалі ў розных побытавых, абрадавых і мастацкіх мэтах. З саламяных жгутоў, змацаваных лазовымі стужкамі, выраблялі разнастайны гаспадарчы посуд для захавання сыпкіх прадуктаў: кублы, шыяны, меркі, сявалкі. Залацістыя

саломінкі спляталіся ў доўгую плоскую стужку, якую сшывалі ў традыцыйны атрыбут летняга мужчынскага адзення – капялюш-брыль. З нарэзаных саломінак, нанізаных на нітку, збіралі «павукоў» – адмысловыя крышталічныя канструкцыі, якія падвешваліся да столі на покуці, каб аберагаць жыллё і яго насельнікаў ад «злых духаў». З гранёных пляцёнак і рамбічных уставак майстравалі розныя куфэркі і скарбонкі. Унікальная з'ява ў сусветнай культуры – выкарыстанне саломы для вырашэння манументальна-дэкаратыўных задач: у некаторых цэрквах Прыпяцкага Палесся ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. з саломы выплятали іканастасы і іншае ўбранства інтэр'ера.

Больш позняя па часе аплікацыя саломай на плоскай паверхні звязана ўжо з чыста дэкаратыўнымі задачамі і пашырэнне на нашых землях набыла недзе з канца XIX ст., калі курныя сялянскія хаты саступілі месца «чыстым», якім ужо патрабавалася нейкае аздабленне інтэр'ера. Да вышываных ручнікоў і тканых узорыстых посцілак натуральна і гарманічна дадаліся вырабы, аздобленыя выклеенымі саламянымі ўзорамі. Саломінкі разразалі ўздоўж, разгладжвалі, наразалі ромбікамі, зубчыкамі, палоскамі, з якіх выклейвалі адмысловыя ўзоры на драўляных, таніраваных у чорнае ці карычневае куфэрках, сальнічках, рамках. Падобным чынам аздаблялі і вялікія насценныя дываны, што мацаваліся на сцяне над ложкам: і прыгожа, і душу радуе, і выдатна спалучаецца з ткацтвам, вышыўкай, плецёнымі карункамі. Стары, яшчэ даваенных часоў, дыванок з залацістым саламяным букетам, фігуркамі аленяў, вавёрак, галубкоў на чорным палатняным фоне і сёння можна спаткаць у вясковай хаце пад Смаргонню ці Ашмянамі, амаль такі ж самы – дзе-небудзь на Пружаншчыне ці Любаншчыне. Салома натуральная, нефарбаваная, пацямнелая, нібы старое золата, малюнкі звычайна даволі наіўныя, нібы дзіцячыя: рабілі ж, як хто ўмеў, характэрныя традыцыі адносна новага віду народнай мастацкай творчасці яшчэ не выпрацаваліся.

У пасляваенныя часы, калі ручное жніво стала набыткам мінулага, займацца саломапляценнем практычна перасталі. У той жа час мастацтва выклейвання дываноў, наадварот, ажывілася і пашырылася: пасляваенная вёска інтэнсіўна адраджалася, забудоўвалася, яркія, дэкаратыўныя, жыццярадасныя дываны як нельга лепш падыходзілі ў якасці аздобы новага жылля, тым больш што дываны прамысловага вырабу былі практычна недаступныя. На гэтай хвалі і расквітнеў талент асобных майстроў, якія





Інтэр'ер дома М. Русаковіч

колішні хатні аматарскі занятак узнялі на ўзровень сапраўднага мастацтва, часам нават давалі імпульс для развіцця сапраўднага асяродка гэтага віду народнай мастацкай творчасці.

Бадай, найбольш адметным такім асяродкам па праве лічыцца вёска Рухава (Старадарожскі раён). Яго развіццё звязваецца з імем мясцовай майстрыхі Кацярыны Русаковіч (1925–1997), якая аддала любімаму занятку амаль усё жыццё, а закладзеныя ёю традыцыі падхапілі яе вучаніцы і, як каштоўны мастацкі набытак, данеслі да нашых дзён.

Характэрна, што ў аповедах самой майстрыхі ўсё выглядала як быццам вельмі проста, амаль выпадковасцю: «Неяк пасля вайны чалавек мой дровы рэзаў на Любаншчыне. Прыязджае дадому ды расказвае, якое дзіва там бачыў: дываны на сценах, але не тканыя, а саломай выклееныя. Блішчаць, свецяцца… Я і прычапілася: завязі ды завязі паглядзець. Пасадзіў на матацыкл, павёз… Што выпытала там, пра што сама дадумалася. Прыехала – і за работу! Але ж і радасці было, як першы дыван зляпіла! Прачнуся ноччу – а мае наклеечкі свецяцца, зіхацяць. І так ужо мне хораша…».

Пэўна, майстрыха і сама шчыра верыла ў такі шчаслівы выпадак. Але ж калі б так было, то многія маглі б заняцца гэтым мастацтвам, падзівіцца на якое збягаліся з усёй вёскі. Але ўсур'ёз захапіліся творчасцю хіба толькі Ніна Пілюк ды Надзея Русаковіч. Відаць, трэба мецsmåць той асаблівы мастацкі дар, тую цягу да хараства, якімі шчодра надзяліла прырода майстрыху. Яна і ткачыха была выдатная, і вышывальшчыца, яе дом нагадваў музей народнага мастацтва. У гэты створаны чалавечымі рукамі шматфарбны жыццярадасны свет арганічна ўключыліся і саламяныя дываны, якія, як відаць, былі зусім не выпадковасцю, а заканамерным развіццём мясцовых мастацкіх традыцый і сапраўдных творчых, мастацкіх здольнасцей.


Ткачыха, вышывальшчыца, майстрыха аплікацыі Марыя Русаковіч

Кампазіцыя, каларыстыка, матывы дэкору саламяных дываноў – практычна тыя ж, што ў тагачасных тканых, вышываных, маляваных вырабах. У цэнтры – пышны букет кветак, навокал – раслінная гірлянда, як на вышываных накідках ці тканых вырабах мінулага стагоддзя, знаёмыя васьміканцовыя разеткі, як на посцілках-перабіранках, кветкі і лістота больш мяккіх абрысаў, як у папулярнай тады паліхромнай раслiннай вышыўцы. Многія матывы стылізаваны так, нібыта прызначаны для ткацтва з яго перпендыкулярным размяшчэннем нітак. Ды і любімая майстрыхай паліхромія таксама выдае яўны ўплыў ткацкіх традыцый. Можна было б папракнуць яе, што фарбавала анілінам салому, прыгожую саму па сабе, што дываны залішне стракатыя і таму нібыта горшыя за ранейшыя манахромныя. Але гэта не адсутнасць густу, а зноў жа міжвольны ўплыў іншых відаў тагачаснага народнага мастацтва з яго імкненнем да сакавітасці, шматфарбнасці, жыццярадаснасці.

Тэхналагічныя прыёмы аплікацыі саломай на тканіне даволі простыя. Разгладжаныя саламяныя стужачкі наклейваюцца адна да адной на тонкую паперу, і з такой нарыхтоўкі нажніцамі выразаецца пэўны элемент будучай кампазіцыі: лісток, кветкавы

пялёстак, сілуэт птушкі і інш. На кавалку чорнай тканіны, нацягнутай на раму, кампануецца і выклейваецца любы ўзор. З часам саламяная аплікацыя падсыхае, узоры злёгку выпучваюцца, глядзяцца нібы рэльефная чаканка.

Нейкіх папярэдніх эскізаў ці замалёвак майстрыха не рабіла, вобраз будучай работы сам па сабе нараджаўся і выспяваў у галаве. Нешта складвалася ва ўяўленні ў час працы за кроснамі, давалі плён і клопаты па гаспадарцы, у полі, лесе. «Пасу кароў ці раблю што ў двары, а сама прыглядаюся да лісця, кветак, галінак. Сарву лісток, прыкладу, намалюю, а потым клею…». Прыкладна тое ж кажуць у розных кутках Беларусі і іншыя майстрыхі – ткачыхі, вышывальшчыцы, малявальшчыцы. Як відаць, прынцыпы творчасці аднолькавыя, і для ўсіх прырода – асноўная крыніца натхнення.

На жаль, «мода» на саламяныя дываны (як і на тканыя, вышываныя, маляваныя, набіваныя іголкай) была нядоўгай. Ужо ў 80-я гады попыт на іх знік, вырабляць іх перасталі, і толькі Кацярына Русаковіч не кідала сваё прыгожае рамяство, якім займалася ўжо проста «для душы». Шкада, што ёй так і не давялося стаць сведкаю адраджэння цікавасці да арыгінальнага віду народнай мастацкай творчасці, які прынёс шырокую вядомасць яе роднаму паселішчу і наваколлю, склаў яркую старонку ў гісторыі традыцыйнай культуры Беларусі.

Прыкметны рост цікавасці да набыткаў традыцыйнай культуры, характэрны для апошняга часу, вярнуў з нябыту многія заняпалыя ці забытыя віды народнай мастацкай творчасці. Сярод іх аказаліся і саламяныя дываны ў Рухаве і ваколіцах, за што перш за ўсё трэба сказаць словы ўдзячнасці работнікам культуры Старадарожчыны. Яны і ўзяліся за адраджэнне адметнага, але амаль забытага мясцовага рамяства. Адшукалі ў Рухаве майстрыху – Марыю Русаковіч, якая зрэдку па традыцыі прадаўжала займацца калісьці засвоеным мастацтвам саламянай аплікацыі, знаходзіла гэтым творам месца ў інтэр’еры сваёй вялікай хаты, дзе яны арганічна «ўжываюцца» і з саматканымі посцілкамі, і з вышыванымі падушкамі, і, як ні дзіўна на першы погляд, з дыванамі прамысловай вытворчасці і іншымі атрыбутамі сучаснага побыту.

Майстрыха ахвотна занялася творчасцю з мясцовай дзятвой. Адроджаная традыцыя стала



Дыван работы М. Русаковіч

пашырацца, набіраць папулярнасць, асяродкам яе неўзабаве стаў Старадарожскі цэнтр рамёстваў. Сёння тут дзейнічае вялікая пастаянная экспазіцыя – і сабраных у наваколлі старых дываноў, і створаных юнымі майстрамі-гурткоўцамі. Гэта не толькі каштоўны метадычны фонд, але і папулярны турыстычны аб'ект. Прызнанне арыгінальнага віду народнай мастацкай творчасці гісторыка-культурнай каштоўнасцю Беларусі, несумненна, яшчэ больш паспрыяе пашырэнню вядомасці адроджанага мастацкага рамяства.

Апошні факт мае на мэце вырашэнне дзвюх асноўных задач. Першая і галоўная – афіцыйнае, на дзяржаўным узроўні, прызнанне мясцовай мастацкай традыцыі нацыянальна-культурным набыткам, які патрабуе да сябе належнай увагі, падтрымкі ў сваім аўтэнтычным выглядзе, музеефікацыі колішніх узораў, паўтарэння і прадаўжэння традыцыі сучаснымі майстрамі. У гэтых адносінах старадарожскія энтузіясты выяўляюць належную актыўнасць.

У той жа час відавочна, што жыццёвасць традыцыі ў значнай ступені забяспечваецца яе актыўным уключэннем у сучасныя культурныя працэсы. Калі ў сваім аўтэнтычным выглядзе яна сёння ўжо не можа быць запатрабаванай – значыць, трэба шукаць новыя формы і віды мастацкага вырашэння, магчымыя спосабы прымянення ў сучасным асяроддзі. У гэтым напрамку ёсць нямала ўдалых распрацовак, якія дэманструюць творчае развіццё традыцый рухаўскіх дываноў. Найбольш характэрнай ілюстрацыяй можа быць творчасць майстрыхі з Салігорска Раісы Раманені, якая распрацавала новы, сучаснага гучання, напрамак развіцця даўно вядомага ёй рамяства ў суседнім раёне. У яе ўжо не дываны на тканіне, а невялікія пано, выклееныя на цвёрдым таніраваным кардоне (ДВП). Узбагацілася кампазіцыя, у цэнтры якой ужо можна бачыць не толькі традыцыйных галубкоў або аленяў, але і лебедзяў, паўлінаў, зуброў, букет кветак, нацюрморт з прадметаў побыту. Спачатку майстрыха традыцыйна падфарбоўвала салому, але з часам вырашыла максімальна выяўляць натуральную прыгажосць гэтага прыроднага матэрыялу – скажам, прыпальваць саломінкі да залаціста-карычневых адценняў, а цвёрдую аснову таніраваць з расцяжкай колераў. Такое вырашэнне надае яе творам сучаснае гучанне, а выдатная стылізацыя матываў і ювелірнае выкананне пераводзяць іх у разрад твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Невялікія, прыгожыя, з густам зробленыя пано Раісы Раманені – выдатная аздоба любога сучаснага інтэр'ера. Распрацаваная ёю стылістыка аплікацыі – узор для многіх прыхільнікаў гэтага віду мастацкай творчасці ў розных кутках Беларусі, а ў самой майстрыхі ўжо шмат вучаніц, перш за ўсё выпускнікоў студыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Беларускі сувенір» Салігорскага цэнтра дзіцячай творчасці, якой яна даўно і плённа кіруе.

Пошукі шляхоў забеспячэння жыццёвасці мясцовай славутасці на новым узроўні, уключэння яе ў сучасныя культурныя працэсы звязваецца перш за ўсё, зноў жа, з дзейнасцю Старадарожскага раённага цэнтра рамёстваў. Захаванне аўтэнтычнасці і прадаўжэнне традыцыі гарантуецца добра наладжанай сістэмай гуртковай работы. Што да распрацовак сучаснага гучання, якія маглі б знайсці сваё месца ў сённяшняй практыцы, то мясцовыя спецыялісты і майстры актыўна шукаюць варыянты вырашэння гэтай праблемы. У сувязі з актывізацыяй турызму адным з такіх рэальных напрамкаў можа стаць распрацоўка сувенірнай прадукцыі па матывах рухаўскай аплікацыі. Гэта могуць быць розныя вырабы бытавога, мастацкага, сувенірнага прызначэння, аздобленыя як непасрэдна саламянай аплікацыяй, так і яе матывамі ў друкарскім выкананні: каляндарыкі, магніцікі, віншавальныя паштоўкі, сумачкі, футаралы, торбачкі і інш. Уключэнне рухаўскай аплікацыі саломай на тканіне ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь прыкметна актывізавала мясцовых спецыялістаў і майстроў на творчыя пошукі ў гэтым напрамку. Можна спадзявацца, што традыцыйнае мастацкае рамяства, яшчэ нядаўна амаль забытае, але апошнім часам адроджанае, будзе жыць, развівацца і пашырацца як адметная з'ява ў сучаснай нацыянальнай культуры Беларусі.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:**


1. Я. Сахута. Сонечныя ўзоры // Мастацтва Беларусі. 1987. №11. С. 62–64.
2. Сахута Я. М. Народнае мастацтва Беларусі. – Мінск, 1997.
3. Сахута Я. М. Беларускае народнае мастацтва. – Мінск, 2011.